Крынічка

Вядучая рубрыкі Ірына ТАМКОВІЧ. Тэл. 8 (017) 287-18-15

# АРГАНІЧНАЕ ЗЕМЛЯРОБСТВА. З ЧАГО ПАЧАЦЬ?

**Прыхільнікі арганічнага земляробства выступаюць за вырошчванне здаровай прадукцыі — без кампанентаў, якія могуць нанесці шкоду чалавецтву і прыродзе. Канцэпцыя арганічнага земляробства накіравана на падтрыманне раўнавагі і гармоніі ў прыродзе, каб захаваць навакольнае асяроддзе здаровым і жыватворным максімальна доўга. Плюсам арганічнага земляробства таксама з'яўляецца больш высокая пажыўная каштоўнасць натуральных прадуктаў харчавання ў параўнанні з прадукцыяй, вырашчанай з прымяненнем хімічных дабавак.**



Прыступаючы да аднаўлення ўрадлівасці глебы з дапамогай арганічнага земляробства, спачатку высвятляюць, як работы на ўчастку вяліся раней. Гэта магло адбывацца ў наступных варыянтах:

1. Традыцыйнае вядзенне агарода без вузкіх градак і без укрыцця глебы. Гэта значыць зямля заставалася «чорнай».

2. Зусім новы ўчастак, дзе расло пустазелле або лугавая трава.

3. Участак як у другім варыянце, але з розніцай у тым, што ў апошнія гады траву скошвалі і пакідалі на паверхні глебы ў выглядзе мульчы ці сідэратаў.

Лепшы варыянт для пераходу на прыроднае арганічнае земляробства — трэці. Тут, вядома, давядзецца папрацаваць, але галоўнае, што ў гэтым выпадку глеба ўжо падрыхтавана да экалагічнага садоўніцтва і агародніцтва.

## Што важна ў эказемляробстве?

**Пастаянныя градкі**

Гэта вузкія градкі, размешчаныя з поўначы на поўдзень, зробленыя на пастаянным месцы раз і назаўжды. Па іх хадзіць нельга, таму прадумваюць такую сістэму апрацоўкі раслін так, каб ніколі не наступаць на зямлю ў градах.

**Глебавыя падкормы**

Робяць падкормы і пояць глебу з дапамогай сідэратаў і мульчы. Сідэратамі гэта робяць зімой і вясной, калі затрымліваюць снег на паверхні зямлі. А «кандэнсацыйны» летні паліў дапамагае зрабіць мульча.

Рыхліць варта не глыбей 5-7 см. Лепш для гэтага скарыстацца пласкарэзам Фокіна.

**Разнастайнасць культур у адной градзе**

Не варта саджаць на адной градзе толькі бульбу, моркву ці памідоры. У арганічным земляробстве важна разнастайнасць відаў раслін на адным участку.

**Укрыццё глебы на зіму**

Зямля не любіць заставацца голай на зіму. Так з яе выветрываюцца карысныя элементы, перагной, выпарваецца вільгаць. Таму пасля ўборкі ўраджаю лепш засеяць градку сідэратамі.

**Выкарыстанне эфектыўных мікраарганізмаў**

Прэпараты, якія змяшчаюць жывыя мікраарганізмы або іх споры, трапляюць у глебу і раскладаюць арганічныя рэшткі да лёгказасваяльных каранямі раслін. І ніякіх пестыцыдаў і мінеральных угнаенняў!

## З чаго пачаць?

Спачатку складаюць план, дзе і што будзе расці: сад, агарод і як будуць размяшчацца градкі. Аднак для планавання спатрэбіцца час. А калі гэта адбываецца ўвосень, то лепш адразу засеяць участак сідэратамі, а ўжо потым пачаць планаваць. Сеюць наступныя культуры:

- рапс зімавы;
- свірэпіца палявая;
- гарчыца.

Засяваюць іх ўвесь участак (каб пазбавіцца ад шкоднікаў), ці толькі градкі. Але дзеля гэтага іх трэба расплanаваць.

Пры арганічным земляробстве градкі не капаюць. Толькі пры фарміраванні робяць праходы паміж імі лапатай на штык. Зямлю кідаюць на градку. Затым разраўноўваюць граблямі, рыхляць пласкарэзам, і ўсё! Шырыня арганічнай градкі робіцца не больш за 1-1,2 метры.

Градкі паліваюць ЭМ-прэпаратамі для паскарэння раскладання арганікі. Накрываюць участак паперай ці кардонам і пакідаюць на два месяцы. За гэты час дзірван перагніе, у глебу паступяць кісларод і мінеральныя элементы. Пасля гэтага прыступаюць да пасадак.

# СЁННЯ

**Сонца**

| | Усход | Заход | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 8.51 | 17.00 | 8.09 |
| Віцебск — | 8.46 | 16.44 | 7.58 |
| Магілёў — | 8.41 | 16.50 | 8.09 |
| Гомель — | 8.30 | 16.54 | 8.24 |
| Гродна — | 9.05 | 17.17 | 8.12 |
| Брэст — | 8.59 | 17.24 | 8.25 |

**Месяц**

*Першая квадра 20 лістапада. Месяц у сузор'і Авена.*

**Імяніны**

**Пр.** *Вольгі, Ганны, Дзяніса, Івана, Канстанціна, Мікалая, Міхаіла, Пятра.*
**К.** *Маргарыты, Клеменса.*



Фота Андрэя ФЕАКЦІСТАВА.

# ЗАЎТРА




Даты | Падзеі | Людзі

## 23 ЛІСТАПАДА

У краіне

**1893** год — нарадзіўся (в. Навіны, цяпер у Валожынскім раёне) Радзівон Канстанцінавіч Шукевіч-Траццякоў, дзяржаўны і партыйны дзеяч Беларусі, журналіст. У 1919—1921 гадах у Чырвонай Арміі: баец, палітработнік, рэдактар газеты «Красноармейская правда». З 1922 года — да ў Галоўным упраўленні палітыка-асветніцкай работы, старшыня Галоўнага ўпраўлення па справах літаратуры і мастацтва Наркамасвеы БССР, сакратар Мінскага павятовага камітэта КП(б)Б. З 1924-га — рэдактар газеты «Беларуская вёска». У 1931—1936 гадах супрацоўнік Інстытута філасофіі, загадчык масавага сектара Беларускай акадэміі навук.

**1906** год — у Вільні выйшаў першы нумар беларускай газеты «Наша ніва», якая выдавалася да 1915 года. Рэдактары-выдаўцы З. Вольскі, А. Уласаў, І. Луцкевіч. Друкавалася ў друкарні Марціна Кухты. Фінансавую падтрымку газеце аказваў дэпутат Дзяржаўнай думы, памешчык і грамадскі дзеяч Эдвард Вайніловіч. «Наша ніва» адыгрывала важную ролю ў развіцці беларускага нацыянальнага руху і беларускай літаратурнай мовы. Газета публікавала творы членаў Беларускага выдавецкага таварыства Янкі Купалы (паэмы «Курган», «Бандароўна» і інш.), Якуба Коласа (урыўкі паэмы «Новая зямля» і інш.), Максіма Багдановіча, Алеся Гаруна, Змітрака Бядулі, Ядвігіна Ш. і іншых беларускіх пісьменнікаў.




**1943** год — ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў быў вызвалены Брагінскі раён. У вызваленні ўдзельнічалі 55-я і 356-я стралковыя дывізіі 61-й арміі, 68-я асобная танкавая брыгада Беларускага фронту, партызанскі атрад імя Р. І. Катоўскага. У гэты ж дзень быў вызвалены і Хойніцкі раён.

У свеце

**1708** год — руская праваслаўная царква абвясціла анафему гетману Мазепу за здраду Пятру І.

**1875** год — нарадзіўся Анатоль Луначарскі, савецкі палітычны дзеяч, літаратурны крытык, пісьменнік. Актыўны ўдзельнік рэвалюцыі 1905—1907 гадоў і Кастрычніцкай рэвалюцыі. Акадэмік АН СССР.

**1917** год — Саўнаркам РСФСР выдаў дэкрэт аб знішчэнні сасловяў і грамадзянскіх чыноў.

**1921** год — прэзідэнт ЗША Уорэн Гардынг забараніў дактарам прапісваць хворым піва ў якасці лекаў і абыходзіць тым самым «сухі закон».

**1924** год — адбылася першая шырокавяшчальная перадача Маскоўскага радыё. Пачатак рэгулярнага радыёвяшчання ў СССР.



**1942** год — Вялікая Айчынная вайна: завяршана акружэнне 330-тысячнай нямецкай групоўкі пад Сталінградам.

**1990** год — Вярхоўны Савет СССР надзяляе надзвычайнымі паўнамоцтвамі прэзідэнта Міхаіла Гарбачова для падтрымання парадку ў СССР.

Так гаварыў...

**МІКАЛАЙ КАРАМЗІН:**

*«Беды больш за ўсё адкрываюць сілы ў характары людзей і народаў».*

## УСМІХНЕМСЯ

**— Доктар, а можна мне гарэлачкі?**

**— Якая яшчэ гарэлачка?**

**— Не, не цяпер, у будучыні.**

**— Якая яшчэ будучыня?**

**Маладзёжная мода на аверсайз — гэта падсвядомае жаданне даношваць рэчы за старэйшым братам, якога ніколі не было.**

Калі ён яе ўбачыў, разумны гадзіннік памераў пульс, і разумны мабільны банк заблакіраваў карту.

Калі фраза «рух — гэта жыццё» была б праўдай, то блохі жылі б даўжэй за чарапах.




ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

Рэгістрацыйнае пасведчанне нумар 2 ад 17 лютага 2009 года, выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.

ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмнай – 311 17 13 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 311 17 44, маркетынгу — 263 66 73, бухгалтэрыі — 311 17 16.

прыём рэкламы тэл./факс: 311 17 27, e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы несуць рэкламадаўцы.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Передрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

www.zviazda.by

e-mail: info@zviazda.by (для зваротаў): zvarot@zviazda.by

Газета адрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 38200000007667 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, прасп. Незалежнасці, 79/1. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.

Тыраж 10.346. Індэкс 63850. Зак. № 2636.

Нумар падпісаны ў 19.30 22 лістапада 2023 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12